КАНФЕРЭНЦЫЯ
НОВАЯ
БЕЛАРУСЬ 2025

# Праект рэзалюцыі аб ролі моладзі ў змаганні з аўтарытарызмам і абароне дэмакратыі ў Беларусі

Канферэнцыя “Новая Беларусь” – жнівень 2025

Мы, Дэмакратычныя сілы Беларусі,

– з улікам Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека,
– з улікам Еўрапейскай канвенцыі па правах чалавека,
– з улікам Канвенцыі ААН аб правах дзіцяці,
– з улікам Кіраўніцтваў ЕС па абароне праваабаронцаў,
– з улікам Еўрапейскай моладзевай стратэгіі і Моладзевага дыялогу ЕС,
– з улікам пагаршэння сітуацыі з правамі моладзі ва ўмовах аўтарытарнага рэжыму ў Беларусі,

***Прымаючы да ўвагі наступныя абставіны:***

***A.*** моладзь у Беларусі падвяргаецца сістэмным рэпрэсіям, уключаючы адвольныя затрыманні, адлічэнні з універсітэтаў, прымусовы прызыў, індактрынацыю і пераслед,  актыўную дзейнасць ідэолагаў і ідэалагінь і штатных супрацоўнікаў і супрацоўніц КДБ у навучальных установах і прымус студэнтаў і студэнтак данасіць на аднакурснікаў і аднакурсніц;

***B.*** моладзь з'яўляецца адной з найбольш вялікіх груп сярод беларускіх палітзняволеных (у 2025 годзе больш за 300 маладых людзей былі прызнаныя палітвязнямі паводле дадзеных праваабаронцаў), а з 2020 года распачата больш за 1700 крымінальных спраў супраць моладзі па палітычных матывах;

***C.*** рэжым выкарыстоўвае сістэму адукацыі як інструмент палітычнага кантролю, цэнзуры, і індактрынацыі, у тым ліку праз абавязковыя ідэалагічныя заняткі, скарачэнне доступу да беларускамоўнай адукацыі і замену незалежных студэнцкіх арганізацый на праўладныя структуры;

***D.*** беларуская моладзь у выгнанні сутыкаецца з юрыдычнай, эканамічнай і сацыяльнай выключанасцю, у тым ліку абмежаваным доступам да ўніверсітэтаў, праблемамі прызнання дыпломаў, перашкодамі пры працаўладкаванні і атрыманні дазвола на жыхарства;

***E.*** моладзь працягвае арганізоўвацца, супраціўляцца і ўдзельнічаць у дэмакратычных рухах унутры краіны і за яе межамі, у тым ліку праз падпольныя сеткі студэнтаў і студжнтак, культурны актывізм, лічбавую мабілізацыю і адукацыйныя ініцыятывы;

***Прымаем наступную рэзалюцыю:***

1. Выказваем поўную салідарнасць з беларускай моладдзю, якая супраціўляецца аўтарытарызму і спрыяе дэмакратычным пераменам.
2. Прызнаем моладзь палітычнымі суб'ектамі, якія павінны быць уключаныя ў працэсы прыняцця рашэнняў на нацыянальным і міжнародным узроўнях.
3. Асуджаем практыкі рэжыму па палітычнай індактрынацыі, кантраляванні і

мілітарызацыі адукацыі.

4. Заахвочваем збор і публікацыю праверaных дадзеных пра рэпрэсіі супраць моладзі ў супрацоўніцтве з беларускай грамадзянскай супольнасцю і міжнароднымі праваабарончымі структурамі.
5. Заклікаем міжнародных партнёраў увесці мэтавыя санкцыі супраць асоб і інстытуцый, адказных за індактрынацыю і рэпрэсіі супраць моладзі.
6. Заклікаем ЕС, ААН і дэмакратычныя урады распрацаваць спецыяльныя праграмы падтрымкі для беларускай моладзі ў выгнанні, у тым ліку праграмы мабільнасці і праграмы псіхасацыяльнай дапамогі.
7. Заклікаем стварыць адаптыўныя сістэмы прызнання дыпломаў і акадэмічных дакументаў для беларускіх студэнтаў і студэнтак, асабліва для тых, чыя адукацыя была перапыненая з-за рэпрэсій.
8. Заклікаем ЕС і нацыянальныя органы адукацыі пашырыць колькасць стыпендый для беларускіх студэнтаў і студэнтак, асабліва для пацярпелых ад рэпрэсій ці вымушанага перамяшчэння.
9. Заклікаем спрасціць юрыдычныя і бюракратычныя працэдуры для акадэмічнай мабільнасці, уключаючы распрацоўку і імплементацыю гнуткіх візавых і міграцыйных працэдур для моладзі.
10. Падтрымліваем пашырэнне магчымасцяў моладзевай мабільнасці праз праграмы Erasmus+, Creative Europe і іншыя ініцыятывы ЕС, з улікам статусу асоб без грамадзянства або не прызнаных уцекачоў і уцекачак з Беларусі.
11. Падкрэсліваем неабходнасць стварэння моладзевых дэмакратычных прастораў[1] і пашыранага прадстаўніцтва беларускай моладзі ў структурах дэмакратычных сіл.
12. Падтрымліваем сістэмны ўдзел беларускай моладзі ў Моладзевым дыялогу ЕС, праграмах Erasmus+ і транснацыянальных грамадзянскіх ініцыятывах.
13. Рэкамендуем доўгатэрміновыя інвестыцыі ў развіццё лідарства сярод моладзі і стварэнне адукацыйных магчымасцяў, асабліва арганізаваных самой моладдзю.
14. Заклікаем прызнаць беларускую моладзь як актыўную сілу палітычных зменаў і прыцягваць яе да распрацоўкі, ацэнкі і прыярытэтнага планавання праграм.

Даручаем адпаведным органам і працоўным групам дэмакратычных сіл Беларусі:

1 Бяспечныя, інклюзіўныя і даступныя фізічныя або лічбавыя асяроддзі, якія даюць моладзі магчымасць сустракацца, арганізоўвацца, удзельнічаць, вучыцца і дзейнічаць як палітычныя і грамадзянскія суб’екты. Яны адыгрываюць важную ролю ў развіцці дэмакратычнага ўдзелу і сацыяльнай згуртаванасці і мусяць абараняцца і падтрымлівацца дзяржаўнымі інстытутамі. (гл. Recommendation CM/Rec(2022)6 of the Committee of Ministers to member States on protecting youth civil society and young people, п. 2.1 і 3.3)

– інтэграваць моладзевы погляд у свае стратэгіі, рашэнні і камунікацыю;
– супрацоўнічаць з моладзевымі арганізацыямі і нефармальнымі ініцыятывамі ў Беларусі і за яе межамі;
– адсочваць выкананне гэтай рэзалюцыі.

*Прынята ў Варшаве, жнівень 2025 года*